МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
“БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ А.С. ПУШКІНА”

Репозиторий БрГУ

# ВУЧЭБНА–МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ “ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ”

У дзвюх частках

Частка 1

Брэст
БрДУ імя А.С. Пушкіна
2009

УДК 94(476)(075)
ББК 63.3(Беи)

Аўтары:
Н.П. Галімава, П.І. Гарбуль, У.В. Здановіч

Р э ц э н з е н т ы:
кандыдат гістарычных навук, дацэнт Н.М. Кавалёва
кандыдат гістарычных навук, дацэнт А.М. Вабішчэвіч

Репозиторий БрГУ

Гісторыя Беларусі : вучэбна-метадычны комплекс у 2 ч. / Н.П. Галімава [і інш.]; пад агульнай рэд. У.В. Здановіча. – Ч. 1 : – Брэст : Выд–ва БрДУ, 2009. – 128 с.

Выданне змяшчае праграму курса “Гісторыя Беларусі”, прыкладны тэматычны план, тэматыку і планы семінарскіх заняткаў, асноўную і дадатковую літаратуру, крыніцы, асноўныя паняцці, спіс знакамітых асоб, неабходнае абсталяванне для практычных занятак.

Прызначана для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Беларусі дзённай і завочнай форм навучання, выкладчыкаў і настаўнікаў усіх, хто цікавіцца гісторыяй.

УДК 94(476)(075)
ББК 63.3(Беи)

УА
БрДУ, 2009

# ЗМЕСТ


| | | |
|---|---|---|
| 1 | Тлумачальная запіска | 4 |
| 2 | Прыкладны тэматычны план | 6 |
| 3 | Змест вучэбнага матэрыялу | 8 |
| 4 | Планы семінарскіх заняткаў | 22 |


Репозиторий БрГУ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Айчынная гісторыя – вобласць гістарычных ведаў, якая займаецца даследаваннем заканамернасцей і асаблівасцей гісторыі Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён у кантэксце еўрапейскай і сусветнай гісторыі, станаўлення дзяржаўнасці Беларусі, распрацоўкай тэорыі і методыкі вывучэння гістарычных працэсаў, гістарыяграфіі і крыніцазнаўства па даследуемых праблемах.

Курс «Гісторыя Беларусі» выкладаецца на працягу першага – чацвёртага году навучання (2–8 семестры). Усяго на вывучэнне дысцыпліны адводзіцца 780 гадзін, з іх аўдыторных – 320 гадзін (лекцыйных – 184 , семінарскіх – 136 ). У першай частцы вучэбна-метадычнага комплексу змешчаны праграма курса, планы семінарскіх заняткаў, літаратура, абсталяванне для іх правядзення. Для студэнтаў першага курса разлічаны тэмы – 1–7, другога – 8–26, трэцяга – 27–40, чацвёртага – 41–58.

Мэта вывучэння курса заключаецца ў набыцці студэнтамі максімальнай інфармацыі аб асноўных вехах, з'явах, падзеях, імёнах айчыннай гісторыі; у разуменні імі ўзаемапранікненняў, узаемаўплываў народаў, што адбываліся на сумежжы цывілізацый Захаду і Усходу; у фарміраванні гарманічнай творчай, з навукова-гуманістычным светапоглядам, сацыяльна завостранай асобы.

Задачы курса ў тым, каб навучыць студэнтаў знаходзіць прычынна-выніковыя сувязі гістарычных працэсаў і падзей; вызначаць фактары, якія абумовілі змест, характар, асаблівасці рэгіянальнага развіцця; крытычна аналізаваць мінулае і праводзіць яго сувязь з сучаснасцю.

Структура комплекса грунтуецца на вызначэнні і адборы галоўных паняццяў, ідэй, тэндэнцый, фактаў, дат, імён і іншых элементаў гістарычных ведаў і накіравана на тое, каб раскрыць сутнасныя элементы і праявы эканамічных адносін і важнейшых рыс гаспадарчага развіцця; дэмагеаграфічнай характарыстыкі і сацыяльнай стратыфікацыі грамадства; асноўных палітычных падзей і іх уплыву на дзяржаўна-прававую эвалюцыю; канфесійнага і этнакультурнага развіцця; найкаштоўнейшых здабыткаў духоўнага жыцця народа.

Змест комплекса адпавядае сучасным дасягненням гістарычнай навукі.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен:

*ведаць:*

• асноўныя тэорыі грамадскага развіцця, асаблівасці фармацыйнага і цывілізацыйнага падыходаў да вывучэння гісторыі Беларусі;

• этапы фарміравання беларускага народа ў розныя гістарычныя перыяды;

• гістарычныя мадэлі мадэрнізацыі грамадства і дзяржавы, савецкі

вопыт мадэрнізацыі і цывілізацыйнага развіцця беларускага грамадства;

• дасягненні ў развіцці матэрыяльнай і духоунай культуры і культурна-гістарычную спадчыну беларускага народа;

• этапы станаўлення форм дзяржаўнасі на тэрыторыі Беларусі;

• месца і ролю беларускіх зямель у геапалітычных працэсах у розныя гістарычныя перыяды;

*умець:*

• прымяняць фармацыйны і цывілізацыйны падыходы да вывучэння гісторыі пры характарыстыцы асаблівасцей гістарычнага развіцця беларускага народа;

• характарызаваць умовы і вынікі фарміравання беларускага народа ў розныя гістарычныя перыяды;

• аналізавацьпрацэс станаўлення беларускай дзяржаунасці;

• характарызаваць геапалітычнае становішча беларускіх зямель.

Репозиторий Б

ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| | Назва тэмы заняткаў | семінарскія занятткі |
|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 |
| 1. | Каменны век на тэрыторыі Беларусі | 2 |
| 2. | Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі | 2 |
| 3. | Жалезны век на тэрыторыі Беларусі | 2 |
| 4. | Этнічная сітуацыя на землях Беларусі ў раннім сярэднявеччы | 2 |
| 5. | Узнікненне дзяржаўнасці на беларускіх землях | 4 |
| 6. | Беларускія землі ў XII–XIII стст. | 6 |
| 7. | Гаспадарка і грамадскі лад беларускіх зямель у IX-XIII стст. | 4 |
| 8. | Утварэнне Вялікага княства Літоўскага | 2 |
| 9. | Унутрыпалітычнае жыццё гаспадарства ў другой палове XV ст. | 2 |
| 10. | Палітычны лад. Органы ўлады і кіравання ў ВКЛ | 2 |
| 11. | Знешняя палітыка ВКЛ. XIII - першая палова XVI стст. | 2 |
| 12. | Развіццё феадальных адносін у XIV-XV стст. | 2 |
| 13. | Станаўленне фальварачна-паншчыннай гаспадаркі | 2 |
| 14. | Развіццё гарадоў, рамяства і гандлю ў ВКЛ | 2 |
| 15. | Асноўныя крыніцы беларуска-літоўскага права | 2 |
| 16. | Утварэнне беларускай народнасці | 2 |
| 17. | Утварэнне Рэчы Паспалітай | 2 |
| 18. | Статут 1588 г. – аснова заканадаўства ВКЛ | 2 |
| 19. | Контррэфармацыя і Брэсцкая царкоўная унія | 2 |
| 20. | Рэфармацыйны рух на Беларусі | 2 |
| 21. | Антыфеадальная барацьба ў канцы XVI–пачатку XVIII ст. | 2 |
| 22. | Знешняе становішча Рэчы Паспалітай у канцы XVI – пачатку XVIII ст. | 2 |
| 23. | Становішча сельскай гаспадаркі Беларусі ў XVII–XVIII ст. | 2 |
| 24. | Развіццё гарадоў і мястэчак Беларусі ў XVII–XVIII ст. | 2 |
| 25. | Беларусь у перыяд заняпаду Рэчы Паспалітай | 2 |
| 26. | Падзелы Рэчы Паспалітай | 2 |
| 27. | Беларускія землі ў апошняй трэці XVIII – пачатку XIX стст. | 4 |
| 28. | Рэлігійная палітыка Расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі ў апошняй трэці XVIII – першай чвэрці XIX стст. | 2 |
| 29. | Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў 1801-1825 гг. | 4 |
| 30. | Нацыянальнае пытанне ў першай чвэрці XIX ст. | 2 |
| 31. | Грамадска-палітычны рух на беларускіх землях у канцы ХУШ-першай чвэрці XIX ст. | 4 |
| 32. | Беларусь у перыяд вайны 1812 г. | 2 |
| 33. | Асвета ў Беларусі ў апошняй трэці ХУШ-першай чвэрці XIX стст. | 2 |
| 34. | Паўстанне 1830–1831 гг. у Беларусі | 2 |
| 35. | Палітыка Расійскага ўрада на беларускіх землях у1830–1850–я гады | 2 |

Репозиторий БрГУ

| | | |
|---|---|---|
| 36. | Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў 30-50-ыя гады XIX ст. | 2 |
| 37. | Грамадска-палітычны рух на беларускіх землях у 30-50-я гады XIX ст. | 2 |
| 38. | Сялянская рэформа 1861 г. у Беларусі | 2 |
| 39. | Паўстанне 1863 г. у Беларусі | 2 |
| 40. | Буржуазныя рэформы 60-70-х гадоў xix ст. і асаблівасці іх правядзення ў Беларусі | 4 |
| 41. | Сельская гаспадарка Беларусі ў 60–90-я гг. XIX ст. | 2 |
| 42. | Развіццё прамысловасці Беларусі ў 60–90-я гг. XIX ст. | 2 |
| 43. | Эвалюцыя рэвалюцыйнага руху на Беларусі ў другой палове XIX стагоддзя | 2 |
| 44. | Палітычныя партыі і аб’яднанні на Беларусі (канец XIX – пачатак XX). | 2 |
| 45. | Фарміраванне беларускай нацыі. | 2 |
| 46. | Рэвалюцыя 1905–1907 гг. у Беларусі. Трэцячэрвеньскі рэжым. | 2 |
| 47. | Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў пачатку XX ст. | 2 |
| 48. | Беларусь у гады Першай Сусветнай вайны. | 2 |
| 49. | Беларусь падчас Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. | 2 |
| 50. | Станаўленне беларускай дзяржаўнасці. | 2 |
| 51. | Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні ў 20–30-я гг. XX ст. | 2 |
| 52. | Грамадска-палітычнае і культурнае жыццё БССР у 20–30-я гг. XX ст. | 2 |
| 53. | Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы (1921–1939 гг.) | 2 |
| 54. | Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі летам 1941 года | 2 |
| 55. | Нямецка-фашысцкая акупацыя Беларусі. Падпольны і партызанскі рух на Беларусі. | 2 |
| 56. | Развіццё БССР у сяр. 1940-х – 1950-х гг. | 2 |
| 57. | Развіццё БССР у сяр. 1950-х – 1980-х гг. | 2 |
| 58. | Рэспубліка Беларусь на сучасным этапе развіцця. | 2 |

Репозиторий БрГУ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Раздзел 1. Уводзіны ў дысцыпліну “Гісторыя Беларусі”.

Задачы вывучэння курса гісторыі Беларусі. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый – састаўная частка сусветнай гісторыі. Змест і структура курса.

## Раздзел 2. Беларускія землі ў часы першабытнага грамадства, узнікнення дзяржаўнасці і станаўлення феадальных адносін (100 тыс. год да н. э. – сярэдзіна XIII ст.).

Першабытная эпоха на тэрыторыі Беларусі (100–35 тыс. гг. да н.э. – VIII ст. н. э.) Першапачатковае засяленне. Сляды знаходжання першых пасяленцаў, старажытныя стаянкі. Неандэртальцы і краманьёнцы. Насельніцтва тэрыторыі Беларусі ў эпоху бронзы і раннім жалезным веку. З'яўленне індаеўрапейцаў, іх балцкая галіна на беларускіх землях.

Рассяленне славян. Узаемаадносіны з балтамі. Праблема паходжання беларусаў. Сельская абшчына («мір»). Паселішчы і гарадзішчы. Рэлігія і культура крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў.

Раннефеадальныя дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях (IX – першая палова XIII ст.). Праблема ўзнікненя дзяржаўнасці Беларусі. Дзяржаўнасць Полацкай зямлі. Утварэнне Тураўскага княства. Арганізацыя кіравання і дзяржаўны лад у землях-княствах. Звычаёвае і пісьмовае права. Пачаткі судаводства.Феадальная раздробленасць. Барацьба з крыжацкай агрэсіяй і нашэсцем мангола-татараў.

Рэлігія і культура. Сінкрэтызм першабытнай культуры. Язычніцкія вераванні на беларускіх землях. Распаўсюджанне хрысціянства і яго роля ў развіцці культуры. Помнікі архітэктуры, пісьменства, прыкладнога мастацтва. Жыццё і дзейнасць рэлігійна-асветніцкіх дзеячаў: Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Кліменція Смаляціча, Аўраамія Смаленскага.

Этнічныя працэсы на беларускіх землях. Індаеўрапейскі праэтнас. Асноўныя раёны пражывання фіна-ўграў і ранніх балтаў. Балты і славяне на тэрыторыі Беларусі. Тэорыя балцкага субстрату. Аб'яднанні ўсходніх славян (крывічы, дрыгавічы, радзімічы). Перадумовы ўзнікнення беларускага этнасу.

***Ключавыя словы, паняцці:*** фармацыя, першабытна-абшчынны лад, славяне, балты, сельская абшчына, феадалізм, рэлігія, язычніцтва, хрысціянства, сінкрэтызм, культура, пергамент, агіаграфія, эпіграфіка, апокрыф, архітэктура, дойлідства, дзяржава, нарманская тэорыя, веча, князь, пасаднік, тысяцкі, звычаевае права, судаводства, этнас, этнагенэз, індаеўрапейцы, субстрат.

## Раздзел 3. Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае ў XIII – першай палове XVIст.

Утварэнне і ўмацаванне Вялікага Княства Літоўскага. Асноўныя падыходы да праблемы ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага. Першыя звесткі пра Літву. Аб'яднаўчыя працэсы ў балта-ўсходне-славянскім рэгіёне ў пачатку XIII ст. Уплыў знешнепалітычнай сітуацыі на ўтварэнне дзяржавы ў верхнім і сярэднім Панямонні. Міндоўг і яго палітыка. Княжанне Войшалка, Трайдзеня, Віценя, Гедзіміна і Альгерда. Уключэнне ў склад ВКЛ Полацкага, Віцебскага, Менскага княстваў і падняпроўскіх зямель. Абвастрэнне ўнутраных супярэчнасцей у Вялікім Княстве Літоўскім у канцы XIV ст. Дынастычная барацьба ў 70-я гг. XIV ст. Княжанне Вітаўта, яго ўнутраная і знешняя палітыка. Барацьба феадальных груповак за ўладу ў 30-я гг. XV ст. Казімір IV і яго палітыка. Палітычныя працэсы на беларускіх землях у канцы ХУ – першай палове ХУІ стст. Значэнне Вялікага Княства Літоўскага ў гісторыі беларускага народа.

Знешняя палітыка Вялікага Княства Літоўскага. Супрацьстаянне з Ордэнам. Давыд Гарадзенскі. «Вялікая вайна». Разгром крыжакоў пад Грунвальдам. Барацьба з мангола-татарамі. Бітва на Сініх Водах. Бітва на рацэ Ворскла і яе значэнне. Падрыхтоўка, заключэнне, змест і вынікі Крэўскай уніі. Знешняя палітыка і войны Вялікага Княства Літоўскага ў першай палове XVI ст. Адносіны Вялікага Княства Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай. Набегі крымскіх татар і барацьба з паўднёвым агрэсарам. Бітва пад Клецкам.

Дзяржаўны лад Вялікага Княства Літоўскага. Сталіцы, герб і мова дзяржаўнага справаводства. Органы дзяржаўнай улады і кіравання. Вялікі князь. Гаспадарская рада. Узнікненне вялікага «вальнага» сойма і сфера яго кампетэнцыі. Вышэйшыя службовыя асобы: маршалак земскі, канцлер, падканцлер, падскарбій земскі, гетманы. Дворныя ўраднікі. Сістэма мясцовага кіраўніцтва дзяржавай: удзельныя князі, ваяводы, кашталяны, старосты і дзяржаўцы. Судовая сістэма і асаблівасці яе існавання ў XIV–XV ст. Эвалюцыя дзяржаўнага ладу Вялікага Княства Літоўскага. Агульназемскія прывілеі 1492 і 1506 гг. Увядзенне павятовага сойміка і рэформа вялікага вальнага сойма. Мясцовае кіраванне. Суды і заканадаўства. Статуты Вялікага Княства Літоўскага 1529, 1566 і 1588 гг. Судовая рэформа. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Вялікага Княства Літоўскага.

Эканамічнае развіццё і сацыяльныя адносіны. Развіццё прадукцыйных сіл у сельскай гаспадарцы. Феадальнае землеўладанне: дзяржаўнае, свецкае і царкоўнае. Магнаты, шляхта, баяры, зямяне. Сялянская гаспадарка і павіннасці сялян, іх юрыдычны стан. «Дымы» і

«дворышчы». Вёскі, сёлы і воласці. Мясцовая адміністрацыя. Гарады і замкі. Склад гарадскога насельніцтва. Рамяство і гандаль. Магдэбургскае права і яго роля ў эканамічным і грамадска-палітычным жыцці гарадоў.

## Раздзел 4. Беларускія землі ў другой палове XVI–XVIII стст.

Люблінская унія 1569 г. Унутры і знешнепалітычныя прычыны аб'яднання ВКЛ з Полыпчай. Лівонская вайна.Падрыхтоўка Люблінскага сойма. Дамаганні шляхты і пазіцыя магнатаў у адносінах да новай уніі. Пачатак работы Люблінскага сойма, спрэчкі аб умовах уніі. Далучэнне да Польшчы Падляшша, Валыні, Падолля і Кіеўшчыны. Падпісанне акта аб утварэнні Рэчы Паспалітай, яго змест і значэнне. Барацьба за захаванне самастойнасці ВКЛ. Распрацоўка і прыняцце Статута 1588 г. Стэфан Баторый, яго ўнутраная і знешняя палітыка. Інтэрвенцыя Рэчы Паспалітай у Маскоўскую дзяржаву ў пачатку XVII ст. Барацьба за Смаленск у 30-я гг. XVII ст.

Гарадское жыццё на беларускіх землях. Колькасны рост гарадоў і гарадскога насельніцтва. Знешні воблік і функцыі гарадоў. Унутраная арганізацыя гарадскога жыцця. Супярэчнасці паміж гарадамі і буйнымі землеўладальнікамі. Сацыяльныя ўнутрыгарадскія канфлікты. Цэхавая арганізацыя працы гарадскіх рамеснікаў. Унутраны і знешні гандаль беларускіх гарадоў.

Усталяванне фальваркава-паншчыннай сістэмы і прыгонніцтва на Беларусі. Феадальнае землеўладанне. Адлучэнне земляроба ад зямельнай уласнасці. З'яўленне і распаўсюджванне фальваркаў. Аграрная рэформа сярэдзіны XVI ст. «Валочная памера» і яе сутнасць. Працэс запрыгоньвання сялян. Асноўныя формы антыфеадальнага пратэсту сялян.

Царква і рэлігія на Беларусі. Прывілеяванае становішча каталіцкай царквы ў ВКЛ. Паступовы крызіс праваслаў'я. Рэфармацыйны рух. Контррэфармацыя. Езуіты і іх дзейнасць на Беларусі. Берасцейскі царкоўны сабор, прыняцце уніяцтва і яго сутнасць. Барацьба вакол уніяцкага пытання ў канцы XVI – першай палове XVII ст.

Беларускае Адраджэнне. Сувязь беларускага Адраджэння з заходнееўрапейскім. Гуманізм. Філасофскія ідэалы і погляды на жыццё Ф. Скарыны. Дзеячы Адраджэння. Сістэма адукацыі ў ВКЛ. Свецкая і царкоўная літаратура. Летапісы і мемуары. Грамадска-палітычная і філасофская думка. Горадабудаўніцтва і архітэктура. Выяўленчае мастацтва. Культура Беларусі ў кантэксце славянскай і еўрапейскай культур.

Казацка-сялянскія рухі сярэдзіны XVII ст. і вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1554–1667 гг. Перадумовы сацыяльных канфліктаў сярэдзіны XVII ст. Казацка-сялянская вайна 1648–1651 гг. і яе характар. Прычыны і

пачатак вайны Расіі з Рэччу Паспалітай. Уступленне ў вайну Швецыі. Кейданская унія. Стаўленне насельніцтва Беларусі да вайны. Пералом у ходзе вайны і яе завяршэнне. Андрусаўскі мір. Спусташэнне беларускіх зямель.

Палітычнае бязладдзе і аслабленне Рэчы Паспалітай у канцы XVII – сярэдзіне XVIII ст. Барацьба магнацкіх груповак у Беларусі. Рэч Паспалітая ў Паўночнай вайне і яе вынікі для беларускіх зямель. Умяшальніцтва замежных дзяржаў у справы Рэчы Паспалітай.

Эканамічны крызіс на беларускіх землях і спробы яго пераадолення. Дэмаграфічны і гаспадарчы крызіс у Беларусі у другой палове XVII ст. Спусташэнне беларускіх зямель у ходзе Паўночнай вайны. Палітыка дзяржавы па пераадоленні крызісу. Стабілізацыя эканомікі Беларусі ў сярэдзіне XVIII ст. З'яўленне капіталістычных элементаў у эканоміцы беларускіх зямель.

Культура XVII–XVIII стст. Гістарычныя ўмовы развіцця культуры беларускага народа. Прычыны ўзмацнення паланізацыі феадальнай вярхушкі і яе вынікі. Пераход справаводства ў ВКЛ на польскую мову. Асветніцтва. Своеасаблівасць і супярэчлівасць эпохі асветніцтва на Беларусі. Стан школьнай асветы і выхавання. Развіццё фальклору. Тэатр. Інтэрмедыі. Батлейка. Свецкая і духоўная літаратура. Кнігадрукаванне. Грамадска-палітычная думка. Архітэктура, скульптура і жывапіс. Развіццё прыкладнога мастацтва. Палацава–сядзібныя забудовы.

***Ключавыя словы, паняцці:*** Вялікае княства Літоўскае, Рэч Паспалітая, манаскія ордэны, крыжакі, мангола-татары, Вялікая вайна, казацтва, Крымскае ханства, Лівонія (Інфлянты), агрэсія, манархія, саслоўна-прадстаўнічыя органы, гаспадарская рада, вальны сойм, павятовыя соймікі, канцлер, гетман, падскарбі, маршалак, ваявода, каштэлян, магдэбургскае права, магістрат, лава, рада, прывілеі, валочная памера, прыгоннае права, Статуты, Канстытуцыя, рэфармацыя, контррэфармацыя, канфесіі, унія, канфедэрацыя, дысідэнты, рокаш, паланізацыя, асветніцтва, готыка, раманскі стыль, паперня, скрыпторый, вотчына, памесце,магнаты, шляхта, нобілі, безкаралеўе, вето,унітарная дзяржава, фальварак, батлейка, беларуска-літоўскія летапісы, кнігадрукаванне.

## Раздзел 5. Беларусь у складзе Расійскай імперыі.

Падзелы Рэчы Паспалітай. Спробы палітычных рэформаў. Дысідэнцкае пытанне. Барская канфедэрацыя і першы падзел Рэчы Паспалітай. Дзейнасць Чатырохгадовага сейма і Канстытуцыя 3 Мая 1791 г. Другі падзел Рэчы Паспалітай. Паўстанне пад кіраўніцтвам

Т. Касцюшкі і яго ход на Беларусі. Трэці падзел Рэчы Паспалітай і ўключэнне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі.

Палітычнае становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел. Змены ў сістэме мясцовага дзяржаўнага кіравання і суда. Насельніцтва (дынаміка колькасці насельніцтва, саслоўная структура, этнаканфесіянальны склад). Саслоўная палітыка. Канфесіянальна-нацыянальнальная палітыка царскага ўрада. Вайна 1812 г. і яе наступствы для Беларусі. Узмацненне палітычнай рэакцыі пасля Венскага кангрэса. Тайныя палітычныя таварыствы ў Беларусі. Паўстанне 1830–1831 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі. Шляхецкая абмежаванасць праграмы яго кіраўнікоў. Змены ў палітыцы царызму ў 30-я гады XIX ст. Ліквідацыя уніяцкай царквы. Грамадскі рух у 30-я–50-я гады XIX ст. (кансерватыўная плынь, ліберальны рух).

Сацыяльна–эканамічнае развіццё. Крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы. Землеўладанне і гаспадарка памешчыкаў. Рост фальваркаў і павіннасцей сялян. Развіццё буйнапамеснай прадпрымальніцкай гаспадаркі. Вотчынная прамысловасць. Пачатак прамысловай рэвалюцыі і яе асблівасці ў Беларусі. Суадносіны дробнай, мануфактурнай і фабрычнай вытворчасці ў канцы 50-х гадоў. Змены ў галіновай структуры прамысловасці ў 1796–1860 гг. Водныя і сухапутныя шляхі зносін. Унутраны і знешні гандаль. Гарады і мястэчкі. Дынаміка колькасці гарадскога насельніцтва ў канцы XVIII–50-х гадах XIX ст. Прычыны рэформаў Кісялёва, іх сутнасць і значэнне. Асноўныя праявы крызісу фальварачна-паншчыннай сістэмы. Падрыхтоўка да адмены прыгоннага права.

Культура Беларусі ў першай палове XIX ст. Адукацыя ў канцы XVIII – пач. XIX ст. Школьная рэформа 1803–1804 гг. Пачатковая і сярэдняя адукацыя. Школьны статут 1828 г. Вышэйшыя навучальныя ўстановы. Развіццё славяназнаўства. Станаўленне беларусазнаўства. Гістарычныя, этнаграфічныя і краязнаўчыя даследаванні. Публікацыі беларускага фальклору ў польскім і расійскім друку. Кнігадрукаванне і перыядычныя выданні. Бібліятэкі. Віды і жанры фальклору. Польскамоўная “краёвая” літаратура. Вытокі і станаўленне новай беларускай літаратуры і літаратурнай мовы. Польскі і расійскі тэатр. Жывапіс. Архітэктура. Прыкладное мастацтва.

Буржуазныя рэформы і контррэформы. Асаблівасці палітыкі царызму ў Беларусі. Аграрныя рэформы другой паловы XIX ст. Ацэнка “Палажэнняў” 19 лютага 1861 г. Асаблівасці рэформы ва ўсходняй і цэнтральна-заходняй Беларусі. Рэалізацыя рэформы 1861 г. Уплыў на яе паўстання 1863 г. Рэформа 1867 г. у дзяржаўнай вёсцы. Вынікі і значэнне аграрна-сялянскіх рэформаў. Феадальныя перажыткі. Рэформы інстытутаў дзяржаўнай улады. Новыя органы ў сістэме мясцовага дзяржаўнага кіравання і суда. Гарадское і

Рэпазіторый БрДУ

сельскае самакіраванне. Асаблівасці палітыкі царызму ў заходніх губернях. Контррэформы. Рэжым выключных законаў у Беларусі.

Развіццё капіталізму і фарміраванне класаў буржуазнага грамадства. Распад дваранскага і рост буржуазнага землеўладанняў. Асаблівасці гэтага працэсу ў Беларусі і іх прычыны. Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі Беларусі. Прамысловая рэвалюцыя. Дынаміка дробнатаварнай, мануфактурнай і фабрычнай вытворчасці. Галіновая структура і размяшчэнне прамысловасці. Развіццё транспарту і сродкаў сувязі. Крэдытныя ўстановы. Уплыў адмены прыгоннага права і прамысловай рэвалюцыі на развіццё гарадоў. Прамысловыя мястэчкі. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства пад уплывам развіцця прамысловасці, транспарту, гандлю. Фарміраванне пралетарыяту і буржуазіі ў вёсцы і ў горадзе. Іх нацыянальны склад. Дынаміка колькасці рабочых у дробнатаварнай, мануфактурнай і фабрычнай вытворчасці. Галінова-прафесійны склад прамысловых рабочых. Рабочыя адыходнікі. Становішча рабочых і сялян.

Вызваленчыя рухі. Паўстанне 1863–1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі. “Чырвоныя” і “белыя”, рэвалюцыйныя дэмакраты і шляхецкія рэвалюцыянеры. Пазіцыя К. Каліноўскага. Барацьба за кіраўніцтва паўстаннем. Тактыка паўстанцаў. Прычыны паражэння і значэнне паўстання. Дынаміка, віды і формы, характар сялянскага руху. Народнікі як выразнікі інтарэсаў дробных вытворцаў. Ідэйна-арганізацыйны крызіс народніцтва. Хваляванні і стачкі рабочых. Пачатак прапаганды марксізму. Пераход сацыял–дэмакратаў да масавай агітацыі і ўздым рабочага руху ў другой палове 90–х гадоў. Утварэнне агульнагарадскіх і рэгіянальных рабочых арганізацый сацыял-дэмакратычнага кірунку. І з’езд РСДРП і яго рашэнні.

Культура Беларусі ў другой палове XIX ст. Змены ў сістэме пачатковай і сярэдняй адукацыі паводле школьнай рэформы 1864 г. Тыпы і колькасць школ. Іх праграмы. Падрыхтоўка настаўнікаў. Удзельная вага пісьменнага насельніцтва ў гарадах і сельскай мясцовасці ў канцы XIX ст. Вывучэнне гісторыі, этнаграфіі, фальклору, мовы, матэрыяльнай культуры беларусаў. Краязнаўчыя даследаванні. “Заходнерусізм”. Кнігадрукаванне. Перыядычныя выданні. Беларуская літаратура. Стан беларускамоўнага друку. Мастацтва. Архітэктура.

Нацыятворчыя працэсы ў Беларусі. Этнічная тэрыторыя беларусаў у XIX ст. паводле звестак тагачаснай навуковай літаратуры, картаграфічных матэрыялаў і перапісу насельніцтва 1897 г. Уплыў прыродна-геаграфічных і кліматычных умоў на традыцыйную матэрыяльную і духоўную культуру беларускага народа. Асаблівасці рассялення, заняткаў, саслоўна-класавай структуры і канфесійнага складу беларускага насельніцтва ў параўнанні з мясцовым рускім, польскім і яўрэйскім насельніцтвам. Узмацненне

Рэпазіторый БрДУ

агульнасці гаспадарчага жыцця ў беларускім рэгіёне ў 60–90-я гады. Унутраныя і знешнія міграцыі насельніцтва краю. Фарміраванне беларускай літаратурнай мовы. Праявы этнічнай самасвядомасці. Нацыянальна-культурны рух у XIX ст. і зараджэнне беларускага нацыянальна-палітычнага руху. Уплыў палітыкі царызму, рэлігійнага фактару на працэс фарміравання сучаснай беларускай нацыі. Эвалюцыя поглядаў на праблему фарміравання нацыі.

***Ключавыя словы, паняцці:*** губерні, генарал-губернатарствы, Паўночна-Заходні край, станы, Дзяржаўная дума, трэцечэрвеньская манархія, земствы, нацыя, менталітэт, нацыянальнае пытанне, шавінізм, нацыяналізм, сіанізм, заходнерусізм, саслоўі, пралетарыят, буржуазія, прамысловая рэвалюцыя, аграрнае пытанне, спецыялізацыя, інкарпарацыя, кансерватары, лібералы, палітычныя партыі, рэвалюцыйныя дэмакраты, прапаганда, агітацыя, народніцтва, марксізм, маніфест, сацыял-дэмакратыя, бальшавікі, меншавікі, рэвалюцыя, контррэвалюцыя, нацыянальны рух, рэвалюцыйная сітуацыя, стачка, забастоўка.

**Раздзел 6. Беларусь на мяжы XIX–XX ст.**

Сацыяльны і нацыянальны склад насельніцтва Беларусі ў пачатку XX ст.; эканамічная і нацыянальная палітыка царызму ў Беларусі. Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Стан і развіццё прамысловасці, яе структура і спецыялізацыя. Прамысловы крызіс у Беларусі 1900–1903 гг. Грамадска–палітычнае жыццё Беларусі. Актывізацыя рабочага руху. З'яўленне палітычных партый і арганізацый. Паліцэйскі сацыялізм. Першыя крокі беларускага нацыянальнага руху. Утварэнне і дзейнасць Беларускай сацыялістычнай грамады. Канфесіі на Беларусі азначанага часу.

Рэвалюцыя 1905–1907 гг. Абвастрэнне аграрна-сялянскага, нацыянальнага і рабочага пытанняў на пераломе XIX – пачатку XX ст. і наспяванне ў 1901–1904 гг. рэвалюцыйнай сітуацыі. Ваганні ў палітыцы царызму. “Паліцэйскі сацыялізм”. Разгортванне сіяніскага руху ў Беларусі. Мясцовыя арганізацыі рэвалюцыйных партый. Рабочы і сялянскі рух. Пачатак рэвалюцыі. Вызваленчы рух у студзені – верасні 1905 г. Кастрычніцкая і снежаньская палітычныя стачкі. Кааліцыйныя саветы і камітэты. Завяршэнне партыйнага афармлення трох палітычных лагераў. Наступленне контррэвалюцыі ў канцы 1905 – пачатку 1906 г. Прадстаўнікі ад беларускіх губерняў у Дзяржаўнай думе. Вяснова-летні ўздым рэвалюцыйнага руху ў 1906 г. і роспуск Думы. Актывізацыя дзейнасці ў Беларусі расійскіх і польскіх нацыяналістычных груповак і перамога іх на выбарах у II Дзяржаўную думу. Беларускі нацыянальны рух у перыяд

рэвалюцыі. Трэцечэрвеньскі дзяржаўны пераварот. Вынікі і значэнне рэвалюцыі для Беларусі.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Рэформы Сталыпіна. Развіццё прамысловасці ў 1900–1913 гг. Пачатак індустрыялізацыі. Структурная і тэхнічная перабудова, паглыбленне спецыялізацыі ў прамысловасці. Акцыянерны капітал і монакапіталістычныя аб'яднанні. Банкаўская справа і крэдытна-фінансавая сістэма. Знешні і ўнутраны гандаль. Транспарт і шляхі зносін. Урбанізацыйныя працэсы. Прычыны, мэты і сутнасць аграрнай рэформы Сталыпіна. Яе вынікі і значэнне. Рост сельскагаспадарчай вытворчасці. Земская рэформа Сталыпіна.

Грамадскі рух у перыяд трэцечэрвеньскага рэжыму. Асаблівасці трэцечэрвеньскага выбарчага закона. Вынікі выбараў у III Дзяржаўную думу ў беларускіх губернях. Вялікадзяржаўны шавінізм у рангу афіцыйнай палітыкі. Становішча ў рэвалюцыйным лагеры. Барацьба "заходнярускіх" і польскіх нацыяналістычных груповак з беларускім нацыянальным рухам. Рабочы і сялянскі рух. Газета "Наша ніва" – ідэйна-арганізацыйны цэнтр беларускага нацыянальнага руху.

Беларусь у гады Першай сусветнай вайны і лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Увядзенне ваенна-паліцэйскага рэжыму. Мабілізацыя. Адносіны да вайны насельніцтва, палітычных партый і рухаў. Адступленне расійскай арміі. Свянцянскі прарыў. Мілітарызацыя прамысловасці і транспарту. Ваенныя павіннасці насельніцтва. Эвакуацыя і бежанства з Беларусі. Заходняя Беларусь пад нямецкай акупацыяй. Эканамічная і нацыянальна-культурная палітыка акупацыйных уладаў. Беларускі нацыянальны рух у зоне акупацыі. Асаблівасці рабочага і сялянскага руху ў перыяд вайны. Пачатак разлажэння арміі. Стан беларускага нацыянальнага руху на расійскай тэрыторыі. Перамога рэвалюцыі ў Петраградзе і яе ўплыў на ўсходнюю Беларусь. Утварэнне Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў і новых органаў улады. Двоеўладдзе ў войску. Губернскія з'езды сялян і іх рашэнні. З'езд беларускіх нацыянальных арганізацый. Адносіны да беларускага нацыянальнага руху расійскіх партый.

Культура Беларусі ў пачатку XX ст. Змены ў сістэме пачатковай і сярэдняй адукацыі. Адкрыццё настаўніцкіх інстытутаў у Віцебску, Магілёве і Мінску і пашырэнне сеткі настаўніцкіх семінарый. Прафесійна-тэхнічнае навучанне. Фарміраванне інтэлігенцыі Беларусі. Даследаванні духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў, гісторыі Беларусі. Дзейнасць медыцынскіх і сельскагаспадарчых таварыстваў. Перыядычны друк і кнігадрукаванне. Поспехі ў развіцці беларускай літаратуры. Станаўленне беларускага прафесійнага тэатра. Музыка. Выяўленчае мастацтва. Архітэктура.

Рэпозиторий БрГУ

***Ключавыя словы, паняцці:*** менталітэт, нацыянальнае пытанне, шавінізм, нацыяналізм, сіанізм, заходнерусізм, саслоўі, пралетарыят, буржуазія, прамысловая рэвалюцыя, мануфактуры, картэль, сіндыкат, трэст, акцыя, манапалізм, аграрнае пытанне, спецыялізацыя, інкарпарацыя, кансерватары, лібералы, палітычныя партыі, рэвалюцыйныя дэмакраты, прапаганда, агітацыя, народніцтва, марксізм, маніфест, сацыял-дэмакратыя, бальшавікі, меншавікі, рэвалюцыя, контррэвалюцыя, нацыянальны рух, рэвалюцыйная сітуацыя, паліцэйскі сацыялізм, стачка, забастоўка, мілітарызацыя, эвакуацыя, бежанства, двоеўладдзе.

## Раздзел 7. Беларусь у часы станаўлення беларускай дзяржаўнасці і міжваенны перыяд (1917–1939 гг.)

Палітычная сітуацыя на Беларусі пасля Лютаўскай рэвалюцыі. Устанаўленне Савецкай улады (сакавік 1917 – сакавік 1918 гг.). Абвастрэнне палітычнай сітуацыі летам 1917 г. Барацьба з карнілаўшчынай. Бальшавізацыя Саветаў. Утварэнне бальшавіцкага ВРК Паўночна-Заходняй вобласці і Заходняга фронту і яго задачы. Нарастанне рэвалюцыйнага крызісу. Ліквідацыя Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага. Стварэнне Абласнога выканаўчага камітэта Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту (Аблвыканкамзаха), яго функцыі і дзейнасць. Асаблівасці грамадска-палітычнага жыцця пасля Лютаўскай рэвалюцыі. Актывізацыя дзейнасці палітычных арганізацый і партый, ажыўленне нацыянальнага руху на Беларусі, яго асаблівасці. Адносіны нацыянальных арганізацый да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Першы Усебеларускі з’езд і яго разгон. Выступленне Доўбар-Мусніцкага супраць Савецкай улады. Разрыў Германіяй дагавора аб перамір’і і пераход у наступленне. Брэсцкі мірны дагавор.

Беларусь у гады замежнай інтэрвеніцыі і грамадзянскай вайны (сакавік 1918–1921 гг.). Самавызначэнне беларускага народа. Стварэнне БНР. Стаўленне Германіі да факта абвяшчэння БНР. Галоўная задача, якую ставіла Рада БНР, і немагчымасць яе вырашэння. Палітычны крызіс Рады БНР, прынящце рашэння аб яе самароспуску. Барацьба з германскімі акупантамі. Ануляванне Брэсцкага міранага дагавора. Беларускае пытанне ў палітыцы бальшавікоў. І з’езд КП(б)Б і ўтварэнне Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь (ССРБ). Літоўска-Беларуская ССР (ЛітБел). Польска–савецкая вайна. Акупацыя Польшчай часткі Беларусі. Змаганне супраць польскіх акупантаў. Другое абвяшчэнне ССРБ і дэкларацыя аб яе незалежнасці. Заключэнне Рыжскага мірнага дагавора і падзел Беларусі. Трагічныя вынікі вайны.

Рэпазіторый БГУ

Савецкая Беларусь у 20-я гады XX ст. Асаблівасці пасляваеннай сітуацыі ў Беларусі. Абвастрэнне гаспадарчага крызісу. Увядзенне новай эканамічнай палітыкі. Аднаўленне сельскай гаспадаркі і прамысловасці. Развіццё кааперацыі і гандлю. Адносіны да прыватніка. Вынікі аднаўленчага перыяду. Непаслядоўнасць у ажыццяўленні НЭПа і перадумовы яго згортвання. Грамадска-палітычнае жыццё, яго адносная дэмакратызацыя. Вяртанне ўсходніх тэрыторый. Ажыўленне работы Саветаў. Дзейнасць рабоча-сялянскай інспекцыі. Партыя і прафсаюзы. Пагадненні паміж БССР, РСФСР і іншымі савецкімі рэспублікамі. Удзел БССР ва ўтварэнні Саюза ССР. Дагавор аб правах саюзных рэспублік. Канстытуцыя Беларускай ССР 1927 г. Палітыка беларусізацыі. Станаўленне нацыянальнай сістэмы адукацыі. Інстытут беларускай культуры. Палітызацыя культасветнай работы. Станаўленне вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай школы. Развіццё навукі, літаратуры і мастацтва. Распрацоўка беларускай навуковай тэрміналогіі. Кадравая палітыка.

БССР у канцы 20-х – 30-я гады XX ст. Усталявнне адзінай дзяржаўнай уласнасці на сродкі вытворчасці. Згортванне НЭПа і пашырэнне каманднага кіравання гаспадаркай. Ажыццяўленне індустрыялізацыі: характар, дасягненні, выдаткі. Пачатак калектывізацыі. 1929 г. – “год вялікага пералому”. Наступленне на сялянства. Палітаддзелы МТС. Вынікі калектывізацыі. Грамадска-палітычнае жыццё, яго бюракратызацыя. Палітычныя працэсы. Рэпрэсіі. Культурныя пераўтварэнні. Ліквідацыя масавай непісьменнасці. Пашырэнне школьнай адукацыі. Рэарганізацыя Інбелкульта ў Беларускую акадэмію навук. Згортванне беларусізацыі. Рэформа беларускага правапісу. Барацьба з “нацдэмамі”. Першы з’езд пісьменнікаў БССР. Творчасць беларускіх пісьменнікаў у 30-я гады. Вядучыя тэмы выяўленчага мастацтва. Сацыяльная палітыка савецкай улады. Жыццё насельніцтва. Змены ў абліччы гарадоў.

Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы. Становішча Заходняй Беларусі. Барацьба за нацыянальнае вызваленне і паляпшэнне ўмоў жыцця. Насаджэнне асадніцтва і паланізацыя. Стан сельскай гаспадаркі. Заняпад прамысловасці. Матэрыяльнае становішча працоўных мас. Партызанскі рух у першыя гады польскага панавання. Нацыянальна-вызваленчы рух. Дзейнасць палітычных партый і арганізацый. Беларуская сялянска-работніцкая грамада. КПЗБ. Супраціўленне наступленню польскай рэакцыі. Праблема стварэння адзінага антыфашсцкага фронту.

***Ключавыя словы, паняцці:*** сацыялістычная рэвалюцыя, савецкая ўлада, саветы дэпутатаў, карнілаўшчына, рэвалюцыйны крызіс, Аблвыканкамзах, Брэсцкі мір, інтэрвенцыя, акупацыя, грамадзянская вайна, БНР, БССР, ЛітБел, СССР, Заходняя Беларусь, ваенны камунізм, новая эканамічная палітыка (НЭП), камандна-адміністрацыйная сістэма,

Рэпазіторый БрДУ

кааперацыя, электрыфікацыя, калектывізацыя, індустрыялізацыя, машынатрактарныя станцыі, дваццаціпяцітысячнікі, культурная рэвалюцыя, беларусізацыя, Інбелькульт, рэпрэсіі, нацдэмы, санацыя, парцэляцыя, камасацыя, асадніцтва, Камуністычная партыя Заходняй Беларусі, Таварыства Беларускай школы, Пасольскі клуб, Беларуская сялянска-работніцкая грамада.

**Раздзел 8. Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў.**

Пачатак Другой сусветнай вайны. Уключэнне Заходняй Беларусі ў склад БССР. Пакт Молатава-Рыбентропа і лёс Заходняй Беларусі. Пачатак Другой сусветнай вайны. Агрэсія нацысцкай Германіі супраць Польшчы. Уступленне савецкіх войскаў на тэрыторыю Заходняй Беларусі. Новы дагавор СССР з Германіяй. Перадача Вільні Літве. Устанаўленне савецкай улады ў Заходняй Беларусі. Гаспадарчыя і культурныя пераўтварэнні.

Акупацыя Беларусі. Нападзенне Германіі на СССР. Абарончыя баі Чырвонай Арміі на тэрыторыі Беларусі. Будаўніцтва абарончых аб’ектаў на ўсходзе Беларусі. Народнае апалчэнне. Вынікі двухмесячных баёў савецкіх войскаў у Беларусі. Акупацыйны апарат кіравання. Палітыка генацыду. Рэалізацыя плана “ОСТ”. Карныя экспедыцыі. Канцэнтрацыйныя лагеры і турмы. Гета. Вываз насельніцтва на работу ў Германію. Калабарацыяністы.

Беларусь у барацьбе з нацысцкай Германіяй. Першыя падпольныя камітэты і партызанскія атрады. Наладжванне дзейнасці арганізацый КП(б)Б ва ўмовах акупацыі. Развіццё партызанскага руху. Баявая дзейнасць партызанскіх фарміраванняў. Развіццё падпольнага руху. Антыфашысцкія патрыятычныя арганізацыі ў заходніх абласцях рэспублікі. Супраціўленне ў гета. Стварэнне і дзейнасць Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР). Характар дзейнасці польскай Арміі Краёвай у Заходняй Беларусі, яе ўзаемаадносіны з савецкімі партызанамі. Дапамога савецкага тылу і мясцовага насельніцтва партызанам і падпольшчыкам. Інтэрнацыянальны характар барацьбы з захопнікамі. Страты, нанесеныя акупантам.

Вызваленне Беларусі, заканчэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў. Пачатак вызвалення Беларусі. Сумесныя дзеянні партызан з часцямі Чырвонай Арміі. Беларуская наступальная аперацыя “Баграціён”. Вызваленне Мінска. Поўнае выгнанне нямецкіх войскаў з тэрыторыі БССР. Беларусы-франтавікі. Аднаўленчыя работы ў народнай гаспадарцы і культуры. Заканчэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў. Уклад беларусаў у агульную барацьбу супраць германскіх захопнікаў. Страты Беларусі ў вайне.

Рэпазіторый БрДУ

***Ключавыя словы, паняцці:*** пакт Молатава-Рыбентропа, Другая сусветная вайна, Вялікая айчынная вайна, фашызм, нацызм, абарончыя баі, народнае апалчэнне, генацыд, канцэнтрацыйны лагер, гета, калабарацыянізм, Генеральная акруга, Рух Супраціўлення, партызанскі рух, падпольная барацьба, антыфацысцкія патрыятычныя арганізацыі, Цэнтральны штаб партызанскага руху, Беларускі штаб, рэйкавая вайна, Армія Краёва, нацыяналістычнае падполле, аперацыя “Баграціён”.

## Раздзел 9. Беларусь у пасляваенны перыяд (другая палова 40-х – 80-я гг. ХХ ст.)

Пераход да мірнага жыцця (I945–1953 гг.). Пасляваеннае аднаўленне і развіццё Беларусі. Аднаўленне эканомікі і даваеннай мадэлі эканамічнага развіцця. Становішча народнай гаспадаркі ў першыя пасляваенныя гады. Прамысловасць, транспарт, сувязь. Асаблівасці аднаўленчага працэсу. Стварэнне ў рэспубліцы новых галін прамысловасці. Аднаўленне сельскагаспадарчай вытворчасці. Прымусовая калектывізацыя ў Заходняй Беларусі. Калгасна-саўгасная сістэма. Грамадска-палітычнае і культурнае жыццё. Развіццё літаратуры, друку. Рэпрэсіі ў адносінах да рэпатрыяваных, былых ваеннапалонных, а таксама дзеячаў навукі і культуры, іншых грамадзян. Удзел БССР у заснаванні і дзейнасці ААН. Гандлёва-эканамічныя і культурныя сувязі рэспублікі з іншымі краінамі.

Беларусь у перыяд спробаў палітычных і эканамічных рэформаў і іх згортвання (I953–1985 гг.). Спробы лібералізацыі палітычнай сістэмы. Спыненне масавых рэпрэсій і пачатак рэабілітацыі іх ахвяраў. Змяненні ў жыццядзейнасці партыйнай арганізацыі, Саветаў, прафсаюзаў, камсамола рэспублікі. Асноўныя напрамкі і вынікі рэарганізацыі палітычнай сістэмы. Аднаснасць, непаслядоўнасць і незавершанасць рэформаў. Формы праяўлення сацыяльнай актыўнасці працоўных. Рэформы ў эканоміцы і іх вынікі. Новы этап індустрыялізацыі рэспублікі. Рост прамысловай вытворчасці. Змены ў структуры прамысловасці. Павышэнне ўзроўню механізацыі і аўтаматызацыі вытворчасці. Пагаршэнне экалагічнага становішча. Развіццё сельскай гаспадаркі. Стварэнне сістэмы дапамогі калгасам і саўгасам, умацаванне іх матэрыяльна-тэхнічнай базы. Павелічэнне валавай прадукцыі сельскай гаспадаркі. Змены ў сацыяльнай структуры грамадства. Павышэнне прафесійнага і адукацыйнага ўзроўню працоўных. Паляпшэнне матэрыяльнага становішча насельніцтва. Рост нацыянальнага даходу і даходаў грамадзян – заработнай платы, выплат і льгот з грамадскіх фондаў спажывання. Змены ў аплаце працы калгаснікаў. Увядзенне пенсійнага забеспячэння калгаснікаў. Паляпшэнне жыллёвых умоў, бытавога абслугоўвання насельніцтва.

Рэпазіторый БрДУ

Крызіс адміністрацыйна-каманднай сістэмы і спробы яе рэфарміравання. Дасягненні і распаўсюджанне застойных з'яў у гаспадарцы. Прамысловае развіццё: здабыткі і цяжкасці. Поспехі і супярэчнасці аграрнай вытворчасці. Сацыяльнае становішча народа: планы і рэчаіснасць. Спробы новых падыходаў да сацыяльнай палітыкі. Нарастанне цяжкасцей у сацыяльнай сферы. Праблемы экалагічнага становішча. Здабыткі і праблемы ў развіцці адукацыі, навукі і культуры. Рэформы ў сферы адукацыі, іх непаслядоўны характар. Курс на абнаўленне грамадства. Адсутнасць канцэпцыі пераўтварэнняў. Супярэчнасці індустрыяльнага развіцця. Праблемы аграпрамысловага комплексу. Чарнобыльская катастрофа. Жахлівыя вынікі аварыі. Пазіцыя ўладаў у рабоце па іх ліквідацыі. Рэзкае абвастрэнне экалагічнага становішча. Заняпад сацыяльнай сферы. Крызіснае становішча спажывецкага рынку. Праблемы жылля і сферы паслуг. Дэмакратызацыя грамадскага жыцця. Рост апазіцыйных рухаў. Вяртанне да шматпартыйнасці.

Культурнае жыццё рэспублікі. Формы і метады кіраўніцтва культурай. Увядзенне абавязковай 8-гадовай адукацыі. Развіццё сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі. Курс на ўмацаванне сувязі школы з жыццём. Важнейшыя дасягненні ў галіне навукі. Рост творчых саюзаў. Дасягненні ў развіцці беларускай літаратуры, тэатра, музычнага і выяўленчага мастацтваў. Масавая культура і самасвядомасць.

***Ключавыя словы, паняцці:*** аднаўленчы перыяд, калгасна-саўгасная сістэма, рэпатрыяцыя, Арганізацыя аб'яднаных нацый, лібералізацыя, рэабілітацыя, палітычная сістэма, эканамічныя і палітычныя рэформы, механізацыя, матэрыяльна-тэхнічная база, аўтаматызацыя, экалагічнае становішча, нацыянальны даход, грамадскія фонды, творчыя саюзы, застойны перыяд.

## Раздзел 10. Беларусь на сучасным этапе развіцця.

Развіццё Рэспублікі Беларусь як незалежнай дзяржавы. Узмацненне руху за нацыянальнае адраджэнне і суверэнітэт Беларусі. Жнівеньскія падзеі 1991 г. Заканадаўчае афармленне дзяржаўнай незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Пагадненне ад 8 снежня 1991 г. аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). Міжнароднае прызнанне Рэспублікі Беларусь. Увядзенне прэзідэнцкай формы кіравання краінай. Выбранне першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Рэферэндумы 1995, 1996, 2004 гг. Беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця. Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь.

Навука і культура. Уплыў дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця на актывізацыю духоўнага патэнцыялу рэспублікі. Прыняцце

Рэпазіторый БрДУ

Закона аб адукацыі і Закона аб культуры 1991 г. Рэформа агульна-адукацыйнай школы, змены ў сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў у ВНУ. Інтэграцыя ў міжнародную навуковую супольнасць. Развіццё навукі ў вышэйшай школе. Новы этап у развіцці літаратуры, мастацтва: дасягненні, цяжкасці. Правядзенне музычных фестываляў. Праблемы і перспектывы беларускага культурнага адраджэння.

***Ключавыя словы, паняцці:*** крызіс каманднa-адміністрацыйнай сістэмы, сацыяльная палітыка, перабудова, Чарнобыльская катастрофа, спажывецкі рынак, дэмакратызацыя, апазіцыя, шматпартыйнасць, суверэнітэт, незалежнасць, Садружнасць Незалежных Дзяржаў, саюзная дзяржава, прэзідэнцкая форма кіравання, нацыянальная сімволіка, рэферэндум, беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця, рыначныя адносіны, канфесіі, дэструктыўныя секты.

Репозиторий БрГУ

## ПЛАНЫ СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ

**Тэма 1. Каменны век на тэрыторыі Беларусі** *(2 гадзіны)*

1. Асаблівасці і перыядызацыя каменнага веку.
2. Палееліт.
3. Мезаліт.
4. Неаліт.
5. Гаспадарчыя заняткі і духоўная культура насельніцтва.

***Паняцці:*** Алтахтоннае насельніцтва, анімізм, археалагічная культура, аўтахтоннае насельніцтва, краманьёнцы, ледавіковы перыяд,неандэртальцы, племя, радавая абшчына, род, стаянка, татэмізм, фетышызм, экспансія.

***Персаналіі:*** І. Арцёменка, У. Будзько, М. Гурын, Э. Загарульскі, У. Ісаенка, А. Калечыц, У. Ксяндзоў, Л. Мітрафанаў, Л. Побаль, К. Палікарповіч, Ю. Попель, М. Чарняўскі.

***Абсталяванне:*** карта "Каменны век на тэрыторыі Беларусі".

***Запоўніце табліцу:*** "Археалагічныя культуры неаліту".

| Назва | Лакалізацыя | Характэрныя элементы |
|---|---|---|
| | | |

***Літаратура:***


1. Археалогія Беларусі : у 4 т. – Мінск : Бел. навука, 1997 – Т. 1 : Каменны і бронзавы вякі / Э.М. Зайхоўскі [і інш.]. – 424 с.
2. Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыкл. / Беларус. энцыкл. ; рэдкал.: В.В. Гетаў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – 702 с.
3. Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Мінск : Экаперспектыва, 2000. – Т. 1 : Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – 351 с.
4. Гісторыя Беларусі. Курс лекцый : у 2 ч. / І.П. Крэнь [і інш.]. – Мінск : РІВШ БДУ, 2000. – Ч. 1. – 656 с.
5. Загорульский, Э.М. Древняя история Белоруссии: Очерки этнич. истории и материальной культуры (до IX в.) / Э.М. Загорульский. – Минск : Изд-во БГУ, 1977. – 136 с.
6. Исаенко, В.Ф. Неолит Припятского Полесья / В.Ф. Исаенко. – Минск : Наука и техника, 1976. – 128 с.
7. Калечиц, Е.Г. Памятники каменного и бронзового веков Восточной Белоруссии / Е.Г. Калечиц. – Минск : Наука и техника, 1987. – 155 с.


Репозиторий БрГУ

8. Калечиц, Е.Г. Первоначальное заселение территории Белоруссии / Е.Г. Калечиц. – Минск : Наука и техника, 1984. – 159 с.

9. Ксензов, В.П. Палеолит и мезолит Белорусского Поднепровья / В.П. Ксензов. – Минск : Наука и техника, 1988. – 131 с.

10. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / М.П. Касцюк [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1994. – Ч. 1. – 527 с.

11. Поликарпович, К.М. Палеолит Верхнего Поднепровья / К.М. Поликарпович. – Минск, 1968.

12. Чарняўскі, М.М. Неаліт беларускага Панямоння / М.М. Чарняўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 143 с.

**Тэма 2. Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі** *(2 гадзіны)*

1. Асаблівасці і перыядызацыя бронзавага веку.
2. Плямёны бронзавага веку.
3. Гаспадарчыя заняткі.
4. Духоўная культура.

***Паняцці***: Абрад, амулет, вытворчая гаспадарка, індаеўрапейцы, курган, культ, металургія, міграцыя, энеаліт, правадыр.

***Персаналіі:*** І. Арцёменка, Э. Зайкоўскі, А. Калечыц, М. Чарняўскі.

***Абсталяванне:*** карта “Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі”.

***Запоўніце табліцу:*** “Археалагічныя культуры бронзавага веку”.

| Назва | Лакалізацыя | Характэрныя элементы |
|---|---|---|
| | | |

***Літаратура:***

1. Археалогія Беларусі : у 4 т. – Мінск : Бел.навука, 1997 – Т. 1 : Каменны і бронзавы вякі / Э.М. Зайкоўскі [і інш.]. – 424 с.

2. Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыкл. / Беларус. энцыкл. ; рэдкал.: В.В. Гетаў [і інш.]. – Мінск : БелЭН, 1993. – 702 с.

3. Гістрыя Беларусі : у 6 т. – Мінск : Экаперспектыва, 2000. – Т.1 : Старажытная Беларусь : Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / рэдкал. М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – 351 с.

4. Гісторыя Беларусі. Курс лекцый : у 2 ч. / І.П. Крэнь [і інш.]. – Мінск : РІВШ БДУ, 2000. – Ч. 1. – 656 с.

Репозиторий БрГУ

5. Загорульский, Э.М. Древняя история Белоруссии: Очерки этнич. истории и материальной культуры (до IX в.) / Э.М. Загорульский. – Минск : Изд–во БГУ, 1977. – 136 с.

6. Исаенко, В.Ф. Неолит Припятского Полесья / В.Ф. Исаенко. – Минск : Наука и техника, 1976. – 128 с.

7. Калечиц, Е.Г. Памятники каменного и бронзового веков Восточной Белоруссии / Е.Г Калечиц. – Минск : Наука и техника, 1987. – 155 с.

8. Калечиц, Е.Г. Первоначальное заселение территории Белоруссии / Е.Г. Калечиц. – Минск : Наука и техника, 1984. – 159 с.

9. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / М.П. Касцюк [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1994. – Ч. 1. – 527 с.

10. Артёменко, И.И. Культура раннего бронзового века южной полосы лесов Европейской части СССР / И.И. Артёменко // Эпоха бронзы лесной полосы СССР. – М., 1987.

11. Артёменко, И.И. Культура шнуровой керамики / И.И. Артёменко // Эпоха бронзы лесной полосы СССР. – М., 1987.

12. Артёменко, И.И. Племена Верхнего и Среднего Поднепровья в эпоху бронзы / И.И. Артёменко. – М., 1967.

13. Зайковский, Э.М. Неолит и бронзовый век белорусского Подвинья / Э.М. Зайковский. – Минск, 1985.

14. Чарняўскі, М. М. Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі / М.М. Чарняўскі. – Мінск : Народная асвета, 1981. – 64 с.

**<u>Тэма 3.</u> Жалезны век на тэрыторыі Беларусі** *(2 гадзіны)*

